# Разнастайны свет Белавежскай пушчы

## «ЗУБР — НАША ЎСЁ»

Інтэрв'ю генеральнага дырэктара Дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» Аляксандра БУРАГА

Па традыцыі, пад Новы год «Звязда» прыязджае ў Белавежскую пушчу, каб расказаць сваім чытачам пра наш бясцэнны скарб, агульнанацыянальны сімвал. Летась мы ўжо сустракаліся з новым генеральным дырэктарам нацыянальнага парку Аляксандрам Бурым. Цяпер азначэнне «новы» для Аляксандра Васільевіча не падыходзіць: на сваёй пасадзе ён амаль два гады. І першае пытанне:

**— Што памянялася за год?**

— У гэтым годзе атрымалі сертыфікаты сістэмы лесакіравання і лесакарыстання і ідэнтыфікацыі лясной прадукцыі па прыкмеце паходжання прадукцыі. Павялічана плошча запаведных лясоў з 30 да 57 тысяч гектараў, цяпер яны складаюць 38% тэрыторыі нацыянальнага парку. 90% стараўзроставых лясоў выключана з гаспадарчага карыстання. Цягам года ў нас зноў пабывала некалькі дэлегацый еўрапейскіх экспертаў. Дык вось адзін нямецкі прафесар пасля падрабязнага знаёмства з новым заніраваннем лесу зрабіў выснову: павелічэнне запаведнасці — гэта сур'езны падарунак Еўропе. Яно і зразумела: пушча — буйнейшая крыніца кіслароду ў Еўропе.

Вялікая работа праведзена ў рамках аднаўлення дзеяння Еўрапейскага дыплома. Пра гэта мы з вамі падрабязна гаварылі летась. У працяг тэмы можна адзначыць, што ў лютым мы былі запрошаны ў Страсбург на пасяджэнне Савета Еўропы, дзе прадставілі даклад з каментарыямі экспертаў. Напярэдадні ў нас працавалі эксперты Савета Еўропы. Потым ішла перапіска паміж бакамі, узгадняліся пазіцыі. Вынік дыскусіі быў вынесены на суд пасяджэння. Апошняя інфармацыя, якую мы атрымалі са Страсбурга, абнадзейвае. Чакаецца, што на пасяджэнні ў лютым 2013 года дзеянне дыплома будзе прадоўжана тэрмінам на пяць гадоу.

**— Што чуваць наконт новага намінацыйнага дасье?**

— Як вядома, пушча ў нас з суседзямі-палякамі адна. У нас агульныя задачы па ахове лесу, яго сімвала — зубра. Нашы і польскія навукоўцы разам падрыхтавалі новае намінацыйнае дасье ў камітэт сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Ідэю ў свой час падказалі прадстаўнікі Міжнароднага саюза аховы прыроды. Яны ўказалі чам на магчымасць намінацыі яшчэ па двух крытэрыях—выключана высокай біялагічнай разнастайнасці і значэнні для эвалюцыі відаў і экасістэм. Спецыялісты названай уплывовай структуры лічаць, што пушча вартая на міжчародным узроўні большага статусу, чым мае. Мы з гэтым згодны, таму і ўзяліся за працу разам з суседзямі. Зараз тэрыторыя сусветнай спадчыны пашырана да 141 тысячы гектараў. Прыняцце новай намінацыі дазволіла б узмацніць значэнне ўнікальнага прыроднага аб'екта для ўсяго чалавецтва. Адчым словам, дакументы мы падалі. Далей чакаем прыняцця рашэння. І ў любым выпадку правадзеная работа не прападзе, яна паслужыць карысці абодвух нашых нацыянальных паркаў.

**— З паведамленняў СМІ мы ведаем, што летам адбылася афіцыйная здача аб'язной дарогі вакол пушчы...**

— Дарога зараз уведзена ў эксплуатацыю. У ліпені гэты аб'ект наведаў кіраўнік дзяржавы і даў высокую ацэнку якасці дарожнага будаўніцтва. Ёсць даручэнне аблвыканкамам па развіцці інфра-структуры і стварэнні пад'язных дарог ад асноўных населеных пунктаў Пружанскага, Камяніцкага, Свіслацкага раёнаў, што прыцягне наведвальнікаў у нацыянальны парк і дазволіць пашырыць экатурызм у рэгіёнах. У аб'язную дарогу ўкладзены вялікія дзяржаўныя сродкі і яна павінна даваць аддачу.

**— Што новага ў сістэме кіравання нацыянальным паркам?**

— За год у многім памянялася сістэма мравання тэрыторыяй. Звязана гэта з укараненнем новых тэхналогій. З дапамогай спадарожнікавай картаграфіі паявілася магчымасць у рэжыме рэальнага часу

адсочваць усё, што адбываецца, і аператыўна прымаць рашэнні. У любы момант на экране ўласнага тэлефона цяпер магу бачыць, дзе я знаходжуся і што робіцца навокал. Укараненне GPS-тэхналогій дае значную эканомію сродкаў. Нават генеральнаму дырэктару цяпер даводзіцца значна меньш калясіць па лесе, адпаведна паліць бензіну, каб бачыць, як працуюць усе службы і што адбываецца ў лесе. Уся тэхніка аснашчана навігацыйнай сістэмай. І з камп'ютара дыспетчарскай службы можна бачыць, дзе зараз знаходзіцца машына альбо трактар, якую работу выконвае тэхніка. Пасля ўстаноўкі вышэйзгаданых праграм наменшыўся расход паліва, нават выраслі вытворчыя паказчыкі на вывазе лесапрадукцыі.

Памянялася на прынцыпова новую ўся сістэма ўліку. Поўнасцю аўтаматызаваны ўлік лесапрадукцыі. Цяпер па маніторы можна адсочваць не толькі работу тэхнікі, але і штодзённы поўны цыкл руху прадукцыі.

Зараз працуем над праграмай аўтаматызацыі гасцінічнага бізнасу і гандлю. Гэта дасць магчымасць вызваліць некаторыя рабочыя месцы і аптымізаваць колькасць штату.

**— Навуковая галіна пушчы надае вялікае значэнне селекцыі.**

— І не толькі. Але селекцыйная работа — адзін з перспектыўных кірункаў навукі. Генетыка гэтага лесу цікавая не толькі для навукоўцаў і лесаводаў рэспублікі — яна выклікае цікавасць і за межамі краіны. Гэта ўнікальны лясны масіў, які развіваўся тысячагоддзямі без уплыву чалавека. Мы маем рэдкую магчымасць збіраць насенне дрэў, якія выраслі да пачатку шкоднага антрапагеннага ўплыву цывілізацыі. Зараз, па сутнасці, закончана будаўніцтва гадавальніка, дзе будуць вырошчвацца саджанцы пушчанскіх дрэў. З названага матэрыялу стане магчыма ўзнаўляць пашкоджаныя ўчасткі лесу, яго ахвотча куляць лясгасы краіны ды і замежчыя партнёры. Ужо зроблены першыя прышчэпкі навукоўцамі Гомельскага інстытута лесу для стварэння лесанасеннай плантацыі. А літаральна сёння мы адправілі пасыдку з жалудамі дуба ў Казахстан.

**— Там будуць расціць нашы дубы?**

— У гэтым годзе Нацыянальны парк наведаў Нурсултан Назарбаеў падчас свайго афіцыйнага візіту ў чашу краіну. Мы паказвалі дубраву, дзе расце чырвонакніжчік — дуб скальны. Такі дуб ёсць яшчэ толькі на поўдні Еўропы. Ён адрозніваецца ад нашага лістом, жалудамі. Спецыяліст убачыць адрозненне і ў ствале дрэва. Дык вось гэтыя дубы вырашыў паспрабаваць развесці ў ваколіцах Астаны кіраўнік Казахстана. Так што абяцаную пасылку мы і перадалі ў пасольства гэтай дзяржавы. Будзем спадзявацца, што нашы дубкі прыжывуцца ў далекам краіне.

**— Як адчувае сябе зубр — цар звяроў?**

— Праграма па захаванні зубра падразумявае як навуковую, так гаспадарчую дзейнасць. На гэтую праграму сёлета з бюджэту было выдзелена 300 мільёнаў рублёў. Яшчэ 2 мільярды рублёў мы накіравалі сваіх сродкаў. Значная частка грошай пайшла на пашырэнне біятэхнічных мерапрыемстваў. Павялічана кармавая база, значна больш засеяна палёў, зроблены новыя сенасховішчы, абсталяваны падкормаччыя пляцоўкі. Ёсць намер па стварэнні селекцыйнага цэнтра на зубры. Зараз вядуцца перамовы паміж вучонымі нашай Акадэміі навук і расійскай менавіта наконт цэнтра селекцыі зубра.

**— Апошнім часам у сродках масавай інфармацыі з'явіліся публікацыі аб тым, што папуляцыя зубра ў пушчы даўно перавысіла сваю норму і патрабуецца аптымізацыя колькасці жывёлы.**

—Такія праблемы ёсць. Вучоныя пралічылі магчымасці кармавой базы і вывелі колькасць пагалоўя зубра, якое можа камфортна пражываць на ахоўваемай тэрыторыі. Атрымалася лічба — 300-350 штук. Зараз мы маем каля 450 асобін. У сувязі з гэтым праблемы ўзнікаюць асабліва ў нашых суседзяў-землекарыстальнікаў. Пра тое не раз пісалі і гаварылі: зубр любіць паесці і, як вы разумееце, не пытае, ці можна на гэтым полі папасвіцца. Таму і скардзяцца аграрыі на патравы.

У гэтым годзе мы значна больш засеялі сваіх палёў, каб утрымаць зубра ў межах нацыянальнага парку. Гэта мела пэўны поспех, удалося сабраць практычна ўсе групоўкі на тэрыторыі нацыянальнага парку. Зафіксаваны толькі адзінакавыя выпадкі выхаду зубра на чужую тэрыторыю ў свіслацкай зоне. Я падрыхтаваў

прапановы наконт павелічэння ахоўнай зоны. Калі зубр, асноўны наш "чырвонакніжнік», выходзіць за межы тэрыторыі пушчы, ён застаецца фактычна бескантрольным. Таму і на прылеглых тэрыторыях варта абмежаваць паляванне, прыняць іншыя меры па абароне жывёлы ад браканьераў. Мы нясем адказнасць за кожную асобіну цара пушчы. Так што захаваць трэба і тых, якія любяць пагуляць па ваколіцах.

Асноўны ж статак у нас заўседы пад наглядам. Усяго ў пушчы шэсць груповая зуброў. Найбольшая з іх знаходзіцца ва ўрочышчы Нікар Хойніцкага лясніцтва.

**— Значыць, вы лічыце неабходным пашыраць кармавую базу і асяродак знаходжання зубра, а не прадаваць ці рассяляць яго па краіне?**

— Прадаваць таксама магчыма. Калі мы маем прыплод, то можам і рэалізоўваць. Іншая справа, што прадаць за мяжу зубра цяпер складана. У партнёраў увесь час дзейнічаюць абмежавана, звязаныя з рознымі хваробамі накшталт свіногa грыпу. Рассяляць па краіне — справа не такая простая, ян можа падацца. Не ўсюды зубр прыжывецца. Ёсць адзін прыклад, які паказвае гэта. У свой час сельгаспрадпрыемства “Азёры” Гродзенскай вобласці вывезла аднаго зубра. З цягам часу ен стаў у іх амаль што дамашняй каровай. У дзікан прыродзе кармавая база больш разнастайная, чым у іншык умовах утрымання. І праз два-тры дзясяткі гадоў знаходжання ў штучных умовах зубр не будзе мець той каштоўнасці, якую ён мае ў дзікай прыродзе. У гэтын аднадушны селекцыннеры, ганетыкі, егеры.

Нічога дрэннага не бачу і ў паляванні на асобных жывёлін. Каб не закопваць ляснога волата, калі ён памрэ па старасці альбо ад хваробы, можна даць магчымасць заможнаму паляўнічаму па існуючых расцэнках прыняць удзел у паляванні, а нам зарабіць валюту, якую мы патрацім на падтрымку папуляцыі зубра.

Але ж галоўная наша задача — захаваць для нашчадкаў гэтую гістарычную, шматпакутную жывёліну. Яшчэ Карцаў пісаў: "Зубр захаваўся дзякуючы пушчы, а пушча захавалася дзякуючы зубру». Таму зубр — гэта наша ўсё. Адзін з кірункоў міжнароднага навуковага супрацоўніцтва таксама датычыць вывучэння зубра.

**— Наколькі нам вядома, навуковае партнёрства вы маеце як на Захадзе, так і на Усходзе.**

— Так. Апошнім часам у нас узніклі плённыя адносіны з германскім нацыямальным паркам “Даліна Ніжняга Одэра”. Гэта адзіны нацыянальны парк, тэрыторыя якога характарызуе рачныя даліны. Узнікла прафама супрацоўніцтва, якая ахоплівае нацыянальныя паркі і вышэйшыя навучальныя ўстановы трох краін: Польшчы, Беларусі і Германіі. Сама прырода, здаецца, падказала гэтую ідэю. Нямецкі парк з'яўляецца трансграннным і пераходзіць на польскую тэрыторыю, а пушча для нас з палякамі таксама адна. Асноўнымі кірункамі сумеснай работы мы вызначылі наступныя: павышэнне стандартаў кіравання еўрапейскімі ахоўнымі тэрыторыямі, абмен вопытам у галіне аховы і маніторынгу навакольнага асяроддзя, турызму, навуковых даследаванняў, адукацыі студэнтаў і іншае.

Дарэчы, я зусім нядаўна ўдзельнічаў у канферэнцыі навукоўцаў ВНУ трох краін, якая прайшла ў Германіі. Абазначана вялікая праграма сумеснай працы. І першы крок на гэтым шляху — «Летняя акадэмія» для студэнтаў. Такім чынам вырашылі назваць праграму летняй практыкі для студэнтаў і іх выкладчыкаў. Гэта будзе свайго роду студэнцкі атрад прыкладна па 10 чалавек ад кожнай краіны, у які ўвойдуць студэнты профільных навучальных устаноў са сваімі выкладчыкамі Па чарзе кожная краіна прадастаўляе навуковую базу свайго парку для правядзення даследаванняў. Мы разлічваем, што частку затрат на «Летную акадэмію» ў нашай пушчы таксама кампенсув заходні партнёр. І з 2014 года акадэмія павінна прыступіць да рабогы.

Плённае супрацоўніцтва вымалёўваецца і ў рамках Саюзнай дзяржавы. Сення і “Байкальская даліна” і Ленінградскі нацыянальны парк выказваюць зацікаўленасць у ажыццяўленні сумесных праектаў.

**—Нацыянальны парк апошнім чынам вядзе немалое будаўніцтва...**

— Будаўніцтва накіравана на паляпшэнне інфраструктуры турызму. Гэтыя магчымасці значна пашырыла дарога, пра якую мы згадвалі ў пачатку гутаркі. Так склалася, што ўсе турыстычныя аб'екгы сканцэнтраваны ў Камянюках, у паўднёвай

часцы пушчы. Трэба задзейнічаць і паўночную частку парку. У раёне вёсак Навасёлкі і Войтаў Мост узводзяцца турыстычныя аб'екты. Запланавана стварэнне турыстычнага цэнтра ў Жаркаўшчыне. Усё гэта поўнач пушчы. Там есць стараўзроставыя лясы, унікальныя прыклады флоры і фаўны, мноства запаведных мясцін. Так што цягам усёй дарогі трэба зрабіць так, каб любы ахвотны мог размясціцца, паесці, адпачыць, заправіць машыну, а таксама папоўніць свае экалагінныя вады і атрымаць асалоду ад знаёмства з прыроднай скарбніцай.

Развіваць турызм — значыць таксама зарабляць сродкі. Селета за 11 месяцаў, напрыклад, мы атрымалі ад гаспадарчай дзейнасці 4 мільёны 585 тысяч долараў. Але гэтага мала для жыццядзейнасці такога вялізнага і разнапланавага комплексу, як Белавежская лушча. 600 гадоў запаведным лесам кіравалі князі, каралі, цары, генеральныя сакратары. Мы адказныя перад гісторыяй і не маем права кіраваць дрэнна альбо нават недастаткова добра. Мы павінны захаваць пушчу, перадаць яе нашчадкам. А для гэтага наперадза яшчэ шмат разнастайных праектаў.

## АХОВА ЛЕСУ І ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Белавежская пушча—гэта перш за ўсё вялізная лясная гаспадарка. Яе складаюць 17 лясніцтваў і лесапаляўнічае прадпрыемства «Выганаўскае». У службе лясной аховы занятыя больш за чатыры сотні чалавек. Пра асаблівасці лясной працы нам расказаае начальнік аддзела аховы лесу і лясной гаспадаркі Васіль ФІЛІМОНАЎ.**

— Галоўнай падзеяй года, — гаворыць Васіль Васільевіч, — можна лічыць падпісанне Указа №59 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб новым функцыянальным зaніраванні лесу. Згодна з гэтым заканадаўчым актам, плошча абсалютна запаведчай зоны складае цяпер 36% тэрыторыі парку. З гаспадарчага карыстання выключаны стараўзроставыя лясы.

Гэта аўтаматычна пацягнула за сабой скарачэнне аб'ёмаў нарыхтоўкі лесу. Калі ў гэтым годзе мы нарыхтоўвалі 160 тысяч кубаметраў драўнічы, то па плане наступнага года будзе толькі 101 тысяча кубаметраў.

У сувязі са змяненнем зон лесу выраблены новыя шыльды і ўказальнікі, якімі абазначаны межы зон. Праведзена работа з насельніцтвам. Жыхароў вёсак склікалі на сходы, дзе людзям тлумачылі, што ў запаведмых зонах забаронена ўсялякая дзейнасць чалавека, у тым ліку збор грыбоў і ягад. Але ж мясцовыя жыхары прывыклі ўсё сваё жыццё карыстацца дарамі лесу, таму для іх выдзелены спецыяльныя месцы, куды можча хадзіць у грыбы і ягады, каб збіраць іх для сваіх патрэб, а не нарыхтоўваць для продажу. Так што тлумачальную работу разглядаем як частку сваёй дзейнасці.

Вялікі калектыў займаецца аховай лесу. Ахоўваць лясныя ўгоддзі — значыць перш за ўсё назіраць і падтрымліваць санітарны стан вядома ж, не дапускаць браканьерства і самавольнага высякання дрэў. Супрацьпажарныя мерапрыемствы тут таксама ажыццяўляе ўласная каманда. Для гэтага існуе неабходны парк тэхнікі, назіральныя вышкі ўстаноўлены ва ўсіх лясніцтвах. На наступны год плануецца ўстаноўка камер відзіаназірання. Ёсць праграма супрацьпажарных мерапрыемстваў, абавязковая для выканання, якая ўвесь час удакладняецца. Таму што пажарная бяспека ў летні, асабліва засушлівы перыяд — стратэгічная задача ўсяго калектыву нацыянальнага парку.

Гаспадарчая дзейнасць ажыццяўляецца па-за межамі запаведнай зоны, у лясах так званай другой катэгорыі. У краіне існуюць нарматывы высячак лесу, прынятыя для ўсіх суб'ектаў гасладарання. Прычым у пушчы, паводле заўвагі Васіля Філімонава, яны яшчэ больш жорсткія.

Нарыхтоўчы цэх мае свой парк тэхнікі. Частка драўніны накіроўваецца на глыбокую перапрацоўку, другая частка ідзе на экспарт. У гэтым годзе пушча атрымала два міжнародныя сертыфікаты PEFC. Адзін з іх сведчыць, што прадукцыя адпавядае агульнапрынятым у свеце нормам якасці, а другі стаў пацвярджэннем таго, што сістэма лесакіравання і лесакарыстання на высокім узроўні.

Догляд маладняку ў лесе механізаваны, вядзецца з дапамогай кустарэзаў. Па меры неабходнасці

праводзяцца санітарныя высечкі лясных дзялянак. Але бывае, што такія мерапрыемствы не сплануеш, патрэбу дыктуюць капрызы прыроды ці нават стыхія. Як было ў ліпені гэтага года, калі па пушчы прайшоўся ўраган. Пацярпела 1030 гектараў лесу — праўда, не на запаведнай тэрыторыі.

— Тады, — расказвае Васіль Філімонаў, — на працягу трох дзён атрымалі дазвол на правядзенне санітарнай высечкі і прыступілі да распрацоўкі буралому. І ўжо сёлета на расчышчанай тэрьгторыі пасаджана 350 гектараў новага лесу. Яшчэ столькі запланавана пасадзіць на наступны год. Аднаўляем пашкоджаны лес і сеем новы з дапамогай уласнай лесачасечнай базы. Летась мы нарыхтавалі насенне сасны і елкі 1-га і 2-га класа. На новым гадавальніку, які займае плошчу 7,1 гектара, заклалі пасяўнов аддзяленне сасны. Выхад пасадачнага матэрыялу сасны-аднагодкі і вякі-аднагодкі складзе каля 3 мільёнаў штук. Гэтага, па-першае, дастаткова нам, па-другое, частку можна прадаць. Наш пасадачны матэрыял адрозніваецца высокімі якасцямі.

Акрамя таго, мы займаемся вырошчваннем дуба. Закладзены яго пасяўныя аддзяленні. Хачу заўважыць, што побач са знакамітай рэзідзнцыяй Дзеда Мароза расце дуб скальны Гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе ёсць названае дрэва. Мы сабралі яго нэсенне і цяпер маем пасадачны матэрыял дуба-адкагодкі, -двухгодкі, -трохгодкі, -сямігодкі.

Насенне мы нарыхтоўваем з элітных дрэў — як дуба, так і сасны. У гэтым рэгулярна дапамагаюць вучоныя нашай Акадэміі навук. Ёсць асобная праграма па стварэнні лесанасачнай плантацыі, якую мы ажыццяўляем агульнымі намаганнямі, падсумаваў Васіль Васільевіч.

Штодзечныя клолаты службы аховы лесу і лясной гаспадаркі датычаць аховы працы, павышэння прафесійнага майстэрства работнікаў. Так, цяперашнім летам новае аснашчэнне атрымаў кабінет аховы працы. Цяпер там на больш высокім узроўні можна праводзіць заняткі, да ўвагі слухачоў шмат нагляднасці і электронных сродкаў навучання.

Бо, напрыклад, перад спаборніцтвам вальшчыкаў лесу ўсе ўдзельнікі прайшлі неабходны інструктаж. Сёлета ўпершыню ладзілася ўласнае спаборніцтва майстроў па валцы лесу. Справа гэта складаная, патрабуе як ведаў, так і ўмення, спрыту, трэніроўкі. У гэтым маглі ўпэўніцца ахвотныя на мерапрыемстве.

Каб былі вынікі работы, людзі павінчы працаваць у належных умовах, — лічаць у адзеле аховы лесу. Таму нацыянальны парк вядзе вялікую работу па мадэрнізацыі лясніцтваў. Усе яны атрымалі камп'ютары. Праведзены рамонт і рэканструкцыя трох памяшканкяў лясніцтваў. Зараз завяршаецца абнаўленне яшчэ трох офісаў. На наступны год запланавана рэканструкцыя трох лясніцтваў і будаўніцтва аднаго новага. Паступова ўсе яны набудуць сучасны выгляд і камфортны інтэр'ер.

Пад эгідай аддзела аховы лесу і лясной гаспадаркі працуе і дарожная служба. У пушчы 120 кіламетраў асфальтаваных дарог. Іх трэба падтрымліваць у надлежным стане. Гэтым займаецца брыгада з чатырох чалавек.

**ЛЮБЫ КАПРЫЗ ТУРЫСТА**

Іван Іванавіч БАТАМ, намеснік дырэктара нацыянальнага парку па турызме і гандлі, зараз заняты ажыццяўленнем аднаго з найцікавейшых праектаў. Каля былой вёскі Перароў, акурат па маршруце агляднай экскурсіі, ствараецца турыстычны комплакс, які пакуль не мае назвы, але будзе нагадваць сядзібу заможнага гаспадара XVIII стагоддзя.

Мясціна знаходзіцца ў раёне 2-й памежнай заставы, дзе ёсць спрошчаны пешы пераход праз беларуска-польскую мяжу. У вёсцы даўно не засталося ніводнага жыхара. Нацыянальны парк зараз займаецца рэканструкцыяй некалькіх дамоў. У адным з іх размесціцца музей народных промыслаў. Гэта будзе не проста музей, а свайго роду майстэрня, дзе вырабы пачнуць ствараць тут жа на вачах наведвальнікаў. Скажам, разьбяр па дрэве выража нейкія сувеніры на продаж і дасць майстар-клас ахвотнаму. А каваль пакажа як ствараецца рэч з металу. Кагосьці, трэба думаць, прывядзе ў захапленне магчымасць уласнаручна выкаваць сабе падкову на шчасце. Будуць і іншыя спрадвечныя народныя рамёствы.

Як сапраўдны сялянскі фальварак, гэты двор займае каня, карову, свіней, курэй, гусей. Госці атрымаюць магчымасць

пазнаёміцца ўвачавідкі са свойскай жывёлай. Работнікі сферы турызму не раз адзначалі, што экскурсанты з вялікіх гарадоў, асабліва дзеці, часта выказваюць поўнае няведанне ў гэтым сэнсе. Прызнаюцца, што каня альбо карову яны бачылі толькі па тэлевізары. Вось цудоўная магчымасць папоўніць прабелы ў ведах.

«ФІШКАЙ» названага гаспадарчага двара абяцае стаць бровар. У спецыяльным памяшканні будзе ўстаноўлены самагонны апарат, дзе вытворчасць пушчанскага напою зноў жа наладзяць на вачах наведвальнікаў. Вядома ж, з дэгустацыяй.

Размову падхоплівае начальнік турыстычнага аддзела Аксана БАГАЛЕЙША. Яна лічыць, што названы праект павінен акупіць сябе даволі хутка. Зараз у дапаўненне да існуючых гасцініц і турыстычных домікаў вядзецца рэканструкцыя Дома рыбака на возеры Лавы, недалёка завяршацца рамонт Дома паляўнічага. Увесь час абнаўляюцца турыстычныя маршруты. Папулярнасцю ў гасцей карыстаюцца электрамабіль і веласіпеды.

Лідарства па попыце, бадай што, трымав 16-кіламетровы веласіпедны маршрут «Звярыны пераход". На працягу падарожжа сустракаецца 200-гадовая прыгажуня елка вышыней больш за 40 метраў — праўда, не самая старая са сваіх суродзічаў. Непадалёку больш за 250 гадоў растуць дзве сасны з шырокай меднай карой. Тая прыгажосць і сіла, якімі надзяліла гігантаў прырода, заварожвае. Праз колькі кіламетраў веласіпедыст сустрэне даволі малады дуб, якому толькі трохі за 300 (у пушчы ёсць дубы, якім па 700 гадоў). Па дарозе трапляюцца нізіннае балотца і лясная сажалка, а таксама месца, дзе праходзіла вузкакалейка.

Падчас Першай сусветчай вайны немцы ўзяліся за прамысловае асваенне пушчы. За 18 месяцаў палонныя французскія і рускія салдаты праклалі 325 кіламетраў вузкіх чыгуначных каляін. Па пуцях увесь час хадзілі маленькія паравозы і цягнулі бярвенне. Акуанты вывезлі тады 4,5 мільёна кубаметраў драўніны. Такога здзеку пушча не цярпела за паутысячы папярэдніх гадоў. Сёння на месцы некаторых вузкакалеек пракладзены асфальтаваныя дарогі. Пра ўсё гэта даведаецца вандроўнік на маршруце. Яшчэ ён заўважыць звярыны пераход. Звяры адшукалі зручны спуск на дарозе з крутымі схіламі і карыстаюцца ім.

Кожны дзвнь тут з'яўляюцца сляды казулі, дзіка, аленя. А ранкам і ўвечары не выключана сустрэча з дзікімі насельнікамі лесу.

А вось сапраўдныя гурманы назірання накіроўваюцца звычайна ў пешы шасцікіламетровы паход. Гэта Экалагічная сцяжына носіць назву "Азёрны пярсцечак» Яна праходзіць сярод сасновых, яловых і чорнаальховых лясоў, якія чаргуюцца з адкрытымі ўчасткамі поймы ракі Правая Лясная, балотцамі, невялікімі палянамі. Упрыгажэннем маршруту служаць невялікія штучныя азёры, створаныя ў 1970-х гадах для падтрымання гідралагічнага рэжыму.

На маршруце абсталяваны месцы адпачынку, дзе можна пасядзець, палюбавацца кветкамі, паслухаць спевы птушак, шорах лістоты, пабыць сам насам з прыродай.

Маршрутау распрацавана шмат. Яны здольны задаволіць любы экалагічны інтарэс турыста.

Да паслуг падарожнага чалавека комплекс сучасных атэляў з рэстаранамі. Ёсць і спартыўны комплекс з басейнам. Летась нацыянальны парк прыняў 380 тысяч турыстаў. Сёлета за 10 месяцау года ў пушчы пабывала 365 тысяч чалавек. Дарэчы, месцаў на навагоднія і калядныя святы даўно няма. Некаторыя госці, адсвяткаваўшы Навагоддзе летась, пакінулі заяўку на гэты год. Так што фарміруецца шэраг пастаянных навадвальнікаў. Асартымемт турыстычных паслуг увесь час расце. Робіцца ўсё, каб задаволіць попыт. Расказвалі цікавы выпадак. Багаты цемнаскуры паляўнічы, стомпены за дзень на паляванні, замовіў сабе масаж. Масажыста тады даставілі з Камянца. Стала відавочна, што такога спецыяліста трэба мець у штаце.

## ГАСПАДЫНЯ ЗАПАВЕДНАГА КВАРТАЛА

Хвойніцкае лясніцтва знаходзіцца на тэрыторыі Пружанскага раёна. Гэта прыклад сапраўднай запаведнай зоны. Тут ужо 50 гадоў ніхто не вядзе ніякай гаспадарчай дзейнасці. 8920 гектараў тэрыторыі ахоўваецца невялікім калактывам лясніцтва. А кіруе ім Валянціна ЛІТВІНОВІЧ.

Валянціна Іванаўна з задавальненмем паказвае свой офіс. Нядаўна ён перажыў рамонт і рэканструкцыю А памяшканне гэта, аказваецца, гістарычнае. Знайшліся сведчанні, што і ў 1936 годзе, пры Польшчы, тут размяшчалася лясная служба. А ў час вайны ў будынку была ваенная камендатура немцаў. Пушча, як вядома, падчас акупацыі была асабістай маёмасцю Герынга. А наглядалі за лесам яго падначаленыя, якія і размясціліся ў вышэйназваным будынку. Ад той пары мала што засталося ў памяшканні, хіба толькі прыгожы разчы каміч, устаноўлены недзе ў 30 х гадах мінулага стагоддзя. Засталіся і сцены. Цяпер яны пакрыты сучасным аддзелачным матэрыялам. А вось падсобныя памяшканні — былыя панскія стайні, складзеныя з добрай драўніны, — мяркуючы па ўсім, прастаяць яшчэ не адзін дзясятак гадоў.

— Маленькая вёсачка Хвойнікі згубілася ў далях пушчанскіх лясоў. Тут значацца 33 жыхары. Насамрэч іх меньш, — расказвае Валянціна Літвіновіч, — асабліва зімой. Накаторыя старыя з'язджаюць да дзяцей на час халадоў. Двух вясковых вучняў возяць на заняткі ў Камянюкі за 27 кіламетраў. Ёсць у Хвойніках свая невялікая крама. Астатняе вырошчваецца на сваім падворку і агародзе.

Цікава, што жыхары такіх вёсак, якія на працягу некалькіх пакаленняў жывуць у лесе, вельмі часта працягваюць справу бацькоў і становяцца лесаводамі. Вось і ў Валянціны Іванаўны муж кіруе суседнім лясніцтвам. Старэйшы сын пасля заканчэння тэхналагічнага ўніверсітэта працуе ў Пружачскім лясгасе. Ну а малодшы Дзіма — адзін з тых, каго пакуль яшчэ возяць у школу.

Працаваць зараз нялёгка, патрабаванні высокія, — прызнаецца Валянціна Літвіновіч. Усе радзей яна, заядлая тэатралка, можа дазволіць сабе выехаць у вялікі горад, каб паглядзець новы спектакль. Але змяніць нешта ў сваім жыцці яна не можа. Бо лес — гэта лёс.

## НАВУКА — РУХАВІК ПРАГРЭСУ

Навуковы аддзел — галоўны рухавік развіцця пушчы. Навуковыя супрацоўнікі пад кіраўніцтвам намесніка генеральнага дырэктара па навукова-доследнай працы Васілём АРНОЛЬБІКАМ распрацоўваюць асновы захавання біялагічнай разнастайнасці прыродных комплексаў Белавежскай пушчы. Даследаванні вядуцца па васьмі раздзелах і ахопліваюць асноўныя віды флоры і фаўны. Варта нагадаць чытачам, што працягласць пушчы з поўначы на поўдзень складае 60 кіламетраў, а з захаду на ўсход — ад 10 да 50 кіламетраў. Гэта ўнікальная лабараторыя для вывучэння біялагічнай разчастайнасці. Геаграфічнае становішча, кліматычныя і глебава-гідралагічныя ўмовы забяспечылі багацце і разнастайнасць флоры. На гэтай параўнальна невялікай тэрыторыі расце больш за тысячу відаў раслін, столькі ж відаў грыбоў, каля 550 відаў імхоў і лішайнікаў.

У пушчы захаваўся ўчастак практычна некранутых першабыных лясоў Еўропы з надзвычай багатым раслінным і жывёльным светам. Сярэдні ўзрост лясоў складае больш чым 100 гадоў, максімальны — 200-300 гадоў, асобныя дрэвы дажываюць да 500-600 гадоў. Сапраўдны скарб парку — мохавыя і травяныя балоты на плошчы ў многія тысячы гектараў. Яны рэгулююць газавы склад атмасферы і гідралагічны рэжым, а таксама адыгрываюць важную ролю ў падтрыманні стабільнасці экасістэм і захаванні біяразнастайнасці не толькі расліннага, але і жывёльнага свету.

У ласе жыве больш за 10 тысяч прадстаўнікоў фаўны. Адных толькі млекакормячых — 59 відаў. Гэтая колькасць магла б быць і большай, аднак асобныя віды на працягу стагоддзяў былі знішчаны. Ужо намаганнямі чалавека некаторыя віды пазней адлоўлены. І найпершы з іх — зубр. Як вядома, апошні прадстаўнік гэтага віду быў забіты ў 1919 годзе. Потым быў доўгі шлях адраджэння статка. Цяпер зуброў у лесе 450.

— У нас ёсць сур'ёзныя напрацоўкі па экалогіі віду, — гаворыць Васіль Арнольбік.

— Апошнім часам актыўна вядзём навуковыя пошукі разам з польскімі калегамі. Апублікавана каля трох дзясяткаў сумесных навуковых прац. Зараз навуковы аддзел распрацоўвае канцэпцыю стварэння ў пушчы рэспубліканскага навукова-селекцыйнага цэнтра па вывучэнні і захаванні зубра.

Усё міжнароднае супрацоўніцтва вядзецца пад эгідай навуковай галіны нацыянальнага парку. І намінацыйныя

дасье, і пакет дакументаў у Савет Еўропы на працяг дыппома, пра якія гаварылася ў інтэрв'ю з генеральным дырэктарам, рыхтаваліся карпатлівай працай навукоўцаў.

Дзякуючы навуковаму абгрунтаванню падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве паміж профільнымі ўніверсітэтамі Беларусі, Польшчы і Германіі і распачынаецца вялікая работа па сумесных даследаваннях вучоных розных краін і экалагічнай адукацыі моладзі. Праграма «Летняй акадэміі» распрацоўвалася ў навуковых кабінетах і лабараторыях.

Любы праект лесаўпарадкавання, нават будаўніцтва новых аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры, рэкламна-маркетынгавая дзейнасць пачынаюцца тут з навуковага абгрунтавання.

## У ГАСЦЯХ У КАЗАЧНАГА ДЗЕДА

Рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза – гэта сапраўдная казка, асабліва снежнай зімой у пераднавагоднія дні. Дамкі-церамкіззяюць рознакаляровым святлом, казачныя героі сустракаюцца ледзь не на кожным кроку. Цяпер у нашай краіне, мабыць, не засталося школы, а раёна — дык дакладна, адкуль дзеці не бывалі ў гасцях у галоўнага беларускага Дзеда Мароза. Едуць сюды людзі не толькі з нашай рэспублікі, але з іншых далёкіх і блізкіх краін. Дзядуля старанна лічыць для цікавасці і статыстыкі замежныя дэлегацыі. Зараз у спісе — каля сотні краін.

Самыя розныя госці едуць да Дзеда і яго ўнучкі Снягуркі. У школьнікаў ён абавязкова распытае, як яны вучацца, якім спортам займаюцца, якія гурткі наведваюць. Дарослым пажадае шчасця і дабрабыту. Бывае, самі наведвальнікі задаюць шмат пытанняў.

— Нядаўна былі ў мяче ветэраны праваахоўных органаў, — з усмешкай расказваў журналістам “Звязды” Дзед Мароз. — Дык яны цікавіліся, у якім снежным царстве захоўваецца мая працоўная кніжка.

Госці бываюць надзвычай цікавыя, распаведаў нам пушчанскі Дзед. Аднойчы завіталі да яго хлопчыкі, выхаванцы кадзцкай школы, пастроіліся каля ганка і ў адзін голас выгукнулі: «Здравия желаем, товарищ Дед Мороз» “Вольно” — адказаў ім гаспадар памесця і запрасіў акунуцца ў казку свайго лесу.

А парламентарыяў з Судана давялося спачатку ратаваць ад холаду, а потым ужо гаварыць з імі праз перакладчыка. У пушчы — мінус 15, а госці з афрыканскай краіны, дзе ніжэй за 20 градусаў цяпла не бывае, так скарчанелі, балюча глядзець было. Запрасіў іх дзед у свой дамок, абагрэў каля каміна. Там і разгаварыліся. Сюды не толькі едуць, але і пішуць лісты. Дзеці дасылаюць малюнкі, якія захоўваюцца ў куфрах і на сценах скарбніцы. На паліцах раскладзены падарункі дзяцей. А нядаўна брастаўчанка падарыла сваю калекцыю вавёрак — каля сотні разнастайных цацак, якія яна збірала больш за дзясятак гадоў. Гэту калакцыю нам паказала Матуля-Зіма, яшчэ адна памочніца галоўнага персанажа рэзідэнцыі. Яна ж распавяла пра змены ў памесці. Цудаў і дзівосаў тут становіцца больш, больш стала і казачных герояў. Ёсць нават чароўныя жалуды, якія можна пакінуць у адмысловым кошыку і загадаць патаемнае жаданне.

Цяпер на падыходзе да рэзідэнцыі гасцей прывячае вялікая «Хата Дзеда Мароза». Гэта ўтульная харчэўня з беларускай кухняй, дзе вельмі смачна кормяць. Стравы гатуюцца ў печы — для гэтага ў гаспадынь ёсць чыгункі і іншы патрэбчы посуд. Мэбля і інтэр'ер стылізаваны пад даўніну, нават карамічны посуд падабраны ў адпаведнасці са стылістыкай установы. Дзецям тут заўсёды даспадобы бліны з рознай начынкай, а дарослыя могуць нават пакаштаваць фірменны пушчанскі напой.

***Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК.***

***Источник:*** Звязда.-2012.-18 снеж. (№ 243).-С.4-5.